

Скарыну, што
радзіўся калісь
над Дзвіною,
вандраваў над
яе берагамі, што
аправіў
мужычую мову
ў неўміручы
гнуткі
пергамент.”

# ФРАНЦЫСК СКАРЫНА 1490-1552

***Францыск Скарына нарадзіўся ў канцы XV стагоддзя ў Полацку — адным з крупнейшых гарадоў Вялікага княства Літоўскага. Розныя даследчыкі казалі пра розную дату нараджэння Францыска Скарыны ( 1482 г. , 1490 г., другая частка - 1480)***

# Выточную адукацыю Скарына атрымаў у Полацку



- У 1504 годзе робіцца студэнтам Кракаўскага ўніверсітэта. У 1506 годзе Скарына заканчвае факультэт вольных мастацтваў са ступенню бакалаўра.

У *1512* годзе Францыск Скарына ў г. Падуя здаў экзамены на годнасць доктара медыцыны





- У 1517 годзе засноўвае ў Празе друкарню і выдае кірылічным шрыфтам «Псалтыр», першую друкаваную беларускую кнігу.



- Усяго на працягу 1517—1519 гадоў Францыск перакладае і выдае 23 кнігі Бібліі



- Мова, на якой Францыск Скарына друкаваў свае кнігі, была заснавана на царкоўнаславянскай мове, але з вялікай колькасцю беларускіх слоў.
- Пры гэтым у працах Скарыны заўважаны ўплыў чэшскай і польскай моў.

- У 1520 годзе пераязджае ў Вільню — сталіцу Вялікага княства Літоўскага, дзе засноўвае першую на тэрыторыі дзяржавы друкарню. У ёй Скарына ў 1522 годзе выдае «Малую падарожную кніжку» , а ў 1525 годзе «Апостал».

- У 1525 годзе памірае адзін з фундатараў віленскай друкарні Юрый Адвернік, пасля чаго выдавецкая дзейнасць Скарыны спыняецца.

- Пазней ён жэніцца на ўдаве Адверніка Маргарыце (памерла яна ў 1529 годзе, пакінуўшы маленькае дзіцё).
- У 1529 годзе памірае старэйшы брат Францыска Скарыны Іван.

- Некалькі месяцаў Францыск Скарына праседзеў у пазнанскай турме. 24 траўня 1532 года Жыгімонт I выдае прывілей пра вызваленне Францыска Скарыны з турмы.
- А 21 і 25 лістапада Жыгімонт выдае два прывілеі, па якіх Францыск Скарына не толькі прызнаецца невінаватым і атрымвае волю, але і абарону ад кожных судовых перасследаў, абарону ад арыштаў і поўную недатыкальнасць маёмасці, вызваленне ад павіннасцяў і гарадскіх службаў

- **У 1534 годзе Францыск Скарына паехаў у Маскоўскае княства, адкуль яго выгналі як каталіка, а кнігі спалілі.**

- Дакладная дата яго смерці не ўсталявана, большасць навукоўцаў мяркуюць, што Скарына сканаў каля 1551 года, бо ў 1552 годзе яго сын Сімяён прыязджаў у Прагу па спадчыну.

# Было зроблена шмат помнікаў у гонар Францыска Скарыны





- Помнік ва Ўніверсітэцкім дворыку БДУ



Помнік у Полацку.



- Помнік каля Нацыянальнай Бібліятэкі




Помнік у Лідзе.





- Помнік у Празе.

Помнік у Вільні.





- Помнік у Калінінградзе.

Помнік
У Купалаўскім
скверы



**Падуя**




“Любіце кнігу, бо яна – крыніца мудрасці, ведаў і навукі, лекі для душы”.

Францыск Скарына

У віхурах жыццёвых,
Стагоддзях няспынных,
Ты жывеш, наша мова,
І слывеш салаўём.
Табе моцныя крылы,
Даў Францішак Скарына,
Даў Кастусь Каліноўскі
Табе сэрца сваё.

Прыпеў: Хай гучыць наша песня,
Наша роднае слова,
Дорыць людзям спагаду
І любві пачуццё.
Хай гучыць наша мова,
Беларуская мова,
Гонар нашай дзяржавы,
Беларусі жыццё.

Не адоліць цябе ўжо,
Ніякая навала.
Ты трымаешся моцна,
Як над Нёманам дуб.
На ўвесь свет цябе ўславіў
Геній Янка Купала,
Надзяліў цябе сілай
Мудры Колас Якуб.

Прыпеў: Хай гучыць наша песня,
Наша роднае слова,
Дорыць людзям спагаду
І любві пачуццё.
Хай гучыць наша мова,
Беларуская мова,
Гонар нашай дзяржавы,
Беларусі жыццё (3 разы)